Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна

№ 10 (441)

Субота, 1 красавіка 1961 г.

Цана 1 кап.

## ШКОЛА ВАЖАТЫХ

Бадай, самая складаная прафесія—прафесія педагога, бо выхаваць сапраўднага чалавека, можа, куды цяжэй, чым сканструяваць самую складаную машыну. Людзі, якія прысвяцілі сваё жыццё гэтай святой справе, павінны ўмець знаходзіць «ключык» да своеасаблівых дзіцячых сэрцаў. Студэнты ўніверсітэта імкнуцца да гэтага. Многія з іх пайшлі працаваць важатымі ў піянерскія атрады і робяць сваю справу не абы як, а з любоўю, з агнём у сэрцы, з неўтаймаваным задорам маладосці. Ды цяжка бывае некаторым, ох як цяжка! Асабліва тым, хто да паступлення ва ўніверсітэт не меў справы з дзецьмі. І жаданне ёсць, і аганёк, і сілы, а з чаго пачаць, як пачаць?

Вось і была арганізавана школа важатых у другой палове лютага гэтага года. Позна? Так, позна. Але не будзем дапытвацца, чаму так атрымалася і па чыёй віне. Лепш позна, чым ніколі.

Работу сваю школа пачала даволі цікава. На некалькіх нешматлікіх яшчэ занятках важатыя былі пазнаёмлены з законамі піянерскай арганізацыі, піянерскімі ступенькамі, праслухалі выступленне класнага кіраўніка аб спецыфіцы педагагічнай работы.

Лепшая важатая ўніверсітэта Вольга Шаўчэнка падзялілася вопытам работы. А ёй ёсць аб чым расказаць: і аб сувязі піянераў з брыгадамі камуністычнай працы, і аб цікавых экскурсіях, дыспутах. Неяк нават зайздросна: як гэта ў яе столькі часу, умення, любві да дзяцей.

Самай цікавай часткай заняткаў былі гульні, што праводзіў М. А. Шэйнеман. Будзе што паказаць рабятам, ды і самім добра было пабегаць...

На наступных занятках мяркуецца развучыць бальныя танцы, песні.

Вось і ўсё пра школу важатых, калі не лічыць такога прыкрага факту, што важатыя—першакурснікі аддзялення беларускай мовы і літаратуры ні разу не пабывалі на занятках, лічачы, што іх там нічаму не навучаць. Як няправільна! Навучаць і вас, таварышы. Многаму навучаць. Толькі прыходзьце...

(Наш кар.)

## Наша інтэрв'ю

### Не будзе сумна!

*На вечарах адпачынку ў нас часта бывае вельмі сумна. Патаўкуцца студэнты на танцах і разыходзяцца, незадаволеныя. Нічога цікавага, што б унесла весялосць, нічога захапляючага. І гэта на маладзёжных вечарах!*

*Днямі наш карэспандэнт А. Трукшына гутарыла па гэтаму пытанню з сакратаром камітэта камсамола Раманам Малюковічам.*

*— Хутка гэтага ў нас не будзе,—упэўнена заявіў Р. Малюковіч.—Ва ўніверсітэце пачынае работу школа масавікоў-зацейнікаў, кіраваць якою будзе студэнт першага курса біялагічнага факультэта Леанід Сушкевіч. На першыя заняткі запрошаны масавікі з Палаца прафсаюзаў. Сум з вечароў будзе выгнаны назаўсёды!*

## ЗНАЁМЦЕСЯ: Лена РОКАЧ



ЯНА ўпарта настойвае на сваім: пісаць пра яе не трэба. Ёю ж нічога выдатнага ў жыцці яшчэ не зроблена. Яна зусім простая, такая ж, як і тысячы другіх студэнтаў. Нават ніякіх важных камсамольскіх даручэнняў не выконвала, апрача абавязкаў адказнай за касу ўзаемадапамогі.

А варта было Вользе Шаўчэнка падыйсці да яе і сказаць:

— Лена! Камітэт камсамола накіроўвае ў школы важатых з ліку нашых студэнтаў. Можа, і ты б...

— Я згодна,—адразу ж пачулася ў адказ.

— Тады запішы: школа № 12, 7-в клас.

Назаўтра Лену можна было бачыць у акружэнні піянераў. З душой узялася дзяўчына за справу. Да свята 8-га сакавіка падрыхтавала ўрачысты піянерскі збор, на які былі запрошаны і бацькі. Дзеці пад яе кіраўніцтвам далі канцэрт мастацкай самадзейнасці.

А зараз Лена плануе экскурсію на абутковую фабрыку імя Калініна. Гэта экскурсія дапаможа дзецям устанавіць сувязь з брыгадай камуністычнай працы. І правільна паступае камсамолка Лена Рокач!

Т. ХАРАВЕЦ.

На здымку: студэнтка 3 курса філфака Лена Рокач.



*Студэнт 2 курса геафака Аляксандр Працкевіч гутарыць з вучнямі 36-й школы г. Мінска.*

## У НАВУКОВЫХ ГУРТКАХ

### *ЮБІЛЕЙНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ*

**БІЯФАК.** 150 разоў збіраліся на свае пасяджэнні члены гуртка гідрабіялогіі. На юбілейнае пасяджэнне былі запрошаны былыя гуртkoўцы.

Прафесар Г. Г. Вінберг выступіў з дакладам, у якім расказаў аб гісторыі гуртка гідрабіялогіі.

Сваімі ўспамінамі аб навуковай рабоце ў гуртку падзяліліся госці.

### *АБ РОЛІ РАБКОРА*

**ФІЛФАК.** На чарговым пасяджэнні гуртка журналістыкі з дакладам «Рабкор—грамадскі дзеяч» выступіла студэнтка другога курса Тацяна Харавец.

### *НА ВАЖНУЮ ТЭМУ*

**ГЕАФАК.** У чацвер на пасяджэнні гуртка фізічнай геаграфіі прачыталі даклады студэнтка чацвёртага курса Беланоўская і студэнты трэцяга курса Казека і Каленчыц. Гэта была творчая справаздача аб экспедыцыі на азёры групы Вымна, якая адбылася зімой мінулага года.

## ЦІКАВАЯ ПАЕЗДКА

*26 сакавіка група кимсамольцаў філалагічнага факультэта пабывала ў гасцях у салігорцаў. У клубе камбіната перад рабочымі выступілі маладыя паэты А. Лойка, Ул. Паўлаў, А. Бяржынскі. Яны прачыталі свае новыя вершы.*

*Пасля выступлення паэтаў сіламі студэнтаў філалагічнага факультэта быў дадзены невялікі канцэрт.*

*Пажадана праводзіць такія паездкі часцей, толькі арганізацыя іх жадае многа лепшага.*

Ул. ПАНЕЎ.

# Што паказала педагагічная практыка?

### *„Нам спадабалася праца ў школе",—гавораць студэнты*

**27** САКАВІКА на філфаку была праведзена канферэнцыя па падвядзенню вынікаў педагагічнай практыкі студэнтаў чацвёртых курсаў аддзяленняў рускай і беларускай мовы і літаратуры. З дакладам выступіў кандыдат філалагічных навук І. А. Карабань. Ён адзначыў, што сёлета педпрактыка студэнтаў праведзена больш арганізавана і плённа, чым у папярэднія гады. Большасці студэнтаў практыка залічана на «выдатна» і «добра», прычым выдатных адзнак больш.

— Туды вы ішлі, можна сказаць, вучнямі, адтуль прыйшлі настаўнікамі. Дык давайце цяпер падзелімся сваімі ўражаннямі,—звярнуўся да прысутных Іван Антонавіч.

Слова атрымлівае студэнтка беларускага аддзялення Тамара Бібікава:

— Я прахо... практыку ў сярэдняй ш... 54. Вельмі спадабалася ... у школе. За два месяцы так здружылася з вучнямі, што не хацелася нават пакідаць іх. Але мне здаецца, што выкладчыкі нашых кафедр надта апякаюць студэнтаў. Гэта некалькі звязвае ініцыятыву практыкантаў. Трэба даваць ім больш самастойнасці. Гэта пойдзе толькі на карысць будучым педагогам.

З цікавасцю праслухалі ўсе выступленне настаўніка 42-й сярэдняй школы Канстанціна Сямёнавіча Валасевіча.

— Мне прышлося кіраваць практыкай групы студэнтаў беларускага аддзялення. Вельмі добра аднесліся да практыкі студэнты Аксана Колб, Альфрэд Матрунёнак, Валянціна Гардзейка, Аляксандр Міклуш, Галіна Лябёдка, Людміла Мяцельская і Людміла Яварчук. Пасля ўрокаў яны праводзілі змястоўную выхаваўчую работу. Арганізавалі некалькі калектыўных паходаў у тэатры і кіно, пабывалі ў музеях і кабінетах універсітэта, замянялі на ўроках выкладчыкаў, правялі вечар, прысвечаны 43-й гадавіне Савецкай Арміі, а таксама турысцкія спаборніцтвы. Студэнты аказаліся добра падрыхтаванымі, выявілі нядрэнныя веды па літаратуры і мове. Аднак, па-мойму, двух месяцаў мала для практыкі студэнтаў.

— Узорнымі выхаванцамі праявілі сябе студэнты Валянціна Турчаненка, Вадзім Салееў, Віталі Хрыстараждзественскі, Антон Лысюк, Галіна Курлыкіна,—сказаў Д. Я. Фактаровіч.—Яны правялі ў школе № 19 шаўчэнкаўскі вечар, арганізавалі экскурсію на абутковую фабрыку імя Калініна, працавалі класнымі кіраўнікамі. В. Салееў замяняў настаўніцу па рускай мове і літаратуры, якая была ў адпачынку.



*Аксана Колб вядзе ўрок.*

Д. Я. Фактаровіч выказвае крытычныя заўвагі ў адрас кафедры педагогікі БДУ, якая не наладзіла цесных сувязей са школамі Мінска і студэнтамі ўніверсітэта.

На трыбуне—заслужаны дзеяч навукі, загадчык кафедры беларускай мовы М. І. Жыркевіч.

— Увогуле,—гаворыць ён,— я задаволены педагагічнай практыкай студэнтаў філфака. Але нельга прайсці міма несур'ёзных адносін да практыкі студэнтаў Казака, Жылко, Жулегі. Студэнт Казак не прыслухоўваўся да заўваг кіраўнікоў практыкі, лічыў, што ён ведае больш, чым настаўнікі. Практыку прайшоў толькі на «здавальняюча». «Здавальняюча» атрымаў таксама Жылко, які не заўсёды з'яўляўся ў школу. Студэнту Жулега практыка зусім не залічана.

На канферэнцыі выступалі таксама выкладчыкі т.т. М. А. Шэйнеман, А. А. Сондак, студэнтка Г. Казакевіч.

Удзельнікі канферэнцыі крытыкавалі кафедру педагогікі ўніверсітэта за тое, што не зусім абдумана размеркавалі студэнтаў па школах, не з усімі школамі была ўстаноўлена загадзя дагаворанасць аб практыцы студэнтаў, таму не ўсюды былі вылучаны кіраўнікі практыкі.

Канферэнцыя па падвядзенню вынікаў практыкі вылілася ў шчырую размову аб ганаровай прафесіі настаўніка і была вельмі карыснай для будучых педагогаў.

В. КАВАЛЬКОЎ.

